Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар БДУКМ
_____ Н.У.Карчэўская
25 чэрвеня 2026 г.
Рэгістрацыйны № ВД-6/26-143 эвуч.

ЭКАНОМІКА ТУРЫЗМУ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

2026

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023 № 274, вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

СКЛАДАЛЬНІК:

Д.В.Герасімёнак, загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

Я.Л.Краснова, вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы "Цэнтр сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", кандыдат культуралогіі;

С.А.Пацыенка, дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 9 ад 18.04.2026);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 6 ад 24.06.2026)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Модуль "Тэорыя, гісторыя і арганізацыя турызму" складаецца з вучэбных дысцыплін "Геаграфія турызму", "Гісторыя і арганізацыя турызму", "Турыстычны патэнцыял Беларусі", "Тэорыя турызму", "Менеджмент і маркетынг у турызме", "Тураперэйтынг" і "Эканоміка турызму". Дадзеная вучэбная праграма прызначана для вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Эканоміка турызму".

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Эканоміка турызму" абумоўлена тым, што сучасная турыстычная індустрыя займае значнае месца ў сусветнай эканоміцы. Турызм з'яўляецца найбольш высокадаходнай галіной многіх краін і рэгіёнаў. Паспяховае развіццё турыстычнага бізнесу ў Рэспубліцы Беларусь немагчыма без фарміравання высокакваліфікаваных кадраў у сферы турызму. У сувязі з гэтым атрыманне прафесійных эканамічных ведаў, уменняў і навыкаў з'яўляецца неабходнай умовай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне турызму.

Асноўныя *мэты* вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Эканоміка турызму": азнаёміць студэнтаў з развіццём эканомікі турызму; сфарміраваць у навучэнцаў установы вышэйшай адукацыі сучаснае ўяўленне аб аб'екце, прадмеце эканомікі турызму, эканамічных метадах, якія выкарыстоўваюцца ў дзейнасці турыстычных прадпрыемстваў; выпрацаваць у студэнтаў пэўныя эканамічныя навыкі і ўменні.

Задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Эканоміка турызму":

– даць студэнтам агульнае ўяўленне аб эканоміцы турыстычнага прадпрыемства;

– разгледзець спецыфіку вынікаў эканамічнай дзейнасці;

– азнаёміць студэнтаў з асаблівасцямі абгрунтавання планаў і прыняцця кіраўнічых рашэнняў, а таксама ажыццяўленнем кантроля за іх выкананнем;

– даць уяўленне аб рэзервах павышэння эфектыўнасці вытворчасці;

– раскрыць пытанні выпрацоўкі эканамічнай стратэгіі развіцця турыстычнага прадпрыемства.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны асноўнымі мэтамі прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў выступаюць фарміраванне і развіццё кампетэнцый, заснаваных на гуманітарных ведах, эмацыянальна-каштоўнасным і сацыяльна-творчым вопыце, якія забяспечваюць рашэнне і выкананне грамадзянскіх, сацыяльна-прафесійных, асобасных задач і функцый.

Зместам вучэбнай дысцыпліны прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з вучэбным планам па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны: аналізаваць сучасны стан музейных устаноў Беларусі і замежжа, ацэньваць перспектывы іх далейшага развіцця, у тым ліку ў сувязі з суб'ектамі турыстычнай індустрыі; ствараць інавацыйныя культурныя праекты, укараняць і ацэньваць іх вынікі, распрацоўваць і выкарыстоўваць інавацыйныя тэхналогіі ў музейнай і турыстычнай індустрыі; выяўляць і ацэньваць асноўныя тэндэнцыі развіцця навуковых ведаў і сфер іх прыкладання, аналізаваць ключавыя эканамічныя працэсы і іх уплыў на развіццё краін на розных гістарычных этапах.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Эканоміка турызму" студэнты павінны *ведаць*:

– паняцці "эканамічная дзейнасць турыстычнага прадпрыемства", "асноўныя і абаротныя сродкі", "прыбытак", "рэнтабельнасць", "ліквіднасць" і інш.;

– асноўныя падыходы да коштаўтварэння ў турызме;

– асноўныя праблемы падаткаабкладання ў турызме;

– сутнасць сабекошту турыстычнага прадукту.

умець:

– ажыццяўляць эканамічны аналіз дзейнасці турыстычнага прадпрыемства;

– планаваць дзейнасць турыстычнага прадпрыемства на розных стадыях яго развіцця.

Валодаць навыкамі:

– коштаўтварэння ў турызме;

– планавання дзейнасці турыстычнага прадпрыемства.

У ходзе адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць асабісты каштоўнасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, які гатовы да актыўнага ўдзелу ў сацыяльна-культурным жыцці краіны.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне "Эканоміка турызму" распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з праграмамі вучэбных дысцыплін "Гісторыя і арганізацыя турызму", "Менеджмент і маркетынг у турызме", "Тураперэйтынг" і іншымі вучэбнымі дысцыплінамі, якія служаць падмуркам у набыцці прафесійных ведаў па спецыяльнасці "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны".

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія мэтазгодна выкарыстоўваць пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны, адносяцца: гісторыка-тэматычны падыход; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; камунікатыўныя тэхналогіі; метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць разнастайныя варыянты самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. Для правядзення семінарскіх заняткаў варта выкарыстоўваць методыкі актыўнага навучання, метад малых груп, дыскусійныя формы.

У адпаведнасці з вучэбным планам, на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Эканоміка турызму" усяго прадугледжана 90 гадзін, з іх 36 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 26 гадзін, семінарскія заняткі – 10 гадзін.

Форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне, тэсціраванне. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Уводзіны

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны "Эканоміка турызму". Асноўны паняційна-тэрміналагічны апарат. Класіфікацыя турызму і структура індустрыі турызму. Турызм як дынамічная эканамічная сістэма.

Тэма 1. Развіццё міжнароднага і асаблівасці беларускага турызму на сучасным этапе

Турызм як сусветная эканамічная з'ява. Уплыў міжнароднага турызму на эканамічнае і сацыяльнае жыццё краіны. Асноўныя індыкатары развіцця індустрыі турызму на макра- і мікраўзроўнях. Роля турызму ў нацыянальнай эканоміцы. Турыстычная палітыка і сродкі яе рэалізацыі.

Сістэма кіравання турызмам у Рэспубліцы Беларусь. Структура міжнародных сувязяў і супрацоўніцтва ў галіне турызму. Асноўныя эканамічныя паказчыкі развіцця беларускага турыстычнага рынку.

Тэма 2. Турыстычнае прадпрыемства як суб'ект гаспадарання

Сутнасць турыстычнага прадпрыемства як суб'екта гаспадарання. Эканамічныя і сацыяльныя мэты турыстычнага прадпрыемства. Знешняе і ўнутранае асяроддзе турыстычнага прадпрыемства. Арганізацыйна-прававыя формы і віды турыстычных прадпрыемстваў. Характарыстыка тураператарскай і турагенцкай дзейнасці.

Турыстычны прадукт як вынік дзейнасці турыстычнага прадпрыемства. Асаблівасці, жыццёвы цыкл турыстычнага прадукту. Забеспячэнне якасці турыстычнага прадукту.

Тэма 3. Асноўныя і абаротныя фонды, нематэрыяльныя актывы турыстычнага прадпрыемства

Сутнасць і значэнне асноўных фондаў турыстычнага прадпрыемства (актыўны, пасіўны). Фізічны і маральны знос асноўных фондаў. Аналітычныя паказчыкі асноўных фондаў. Сутнасць і механізм фарміравання абаротных сродкаў прадпрыемства індустрыі турызму. Асноўныя паказчыкі эфектыўнага выкарыстання абаротных сродкаў.

Нематэрыяльныя актывы турыстычнага прадпрыемства.

Тэма 4. Працоўныя рэсурсы і аплата працы ў турызме

Сутнасць працоўных рэсурсаў у турыстычнай дзейнасці. Патрабаванні да супрацоўнікаў турыстычнага прадпрыемства. Паказчыкі эфектыўнасці

выкарыстання кадравага патэнцыялу на прадпрыемстве. Рэгуляванне працоўных адносін у турыстычнай дзейнасці.

Сутнасць і змест заработнай платы. Функцыі заработнай платы. Формы і сістэмы аплаты працы на турыстычным прадпрыемстве. Механізм рэгулявання заработнай платы. Фонд заработнай платы прадпрыемства. Аналіз і планаванне фонду заработнай платы турыстычнага прадпрыемства.

Тэма 5. Фінансавыя рэсурсы турыстычнага прадпрыемства

Сутнасць і функцыі фінансаў турыстычнага прадпрыемства. Фінансавыя рэсурсы. Структура фінансавых рэсурсаў прадпрыемства індустрыі турызму. Элементы фінансавага механізму. Крыніцы фарміравання фінансавых рэсурсаў у турызме.

Узаемаадносіны турыстычнага прадпрыемства з банкамі і страхавымі арганізацыямі. Сутнасць і напрамкі інвестыцыйнай дзейнасці ў турызме.

Тэма 6. Выдаткі прадпрыемства індустрыі турызму

Сутнасць, структура і склад выдаткаў гаспадарчай дзейнасці турыстычнага прадпрыемства. Прамыя і ўскосныя выдаткі. Паняцце сабекошту. Кіраванне выдаткамі вытворчасці на прадпрыемстве індустрыі турызму. Методыка планавання і аналізу выдаткаў вытворчасці.

Тэма 7. Коштаўтварэнне ў турызме

Кошт як эканамічная катэгорыя. Віды і класіфікацыя цэн. Унутраныя і знешнія фактары цэнаўтварэння на турыстычным прадпрыемстве. Віды коштавых стратэгій. Структура і методыка разліку цаны турыстычнага прадукту, паслугі. Напрамкі коштавай палітыкі на прадпрыемствах індустрыі турызму.

Тэма 8. Падаткі і падаткаабкладанне ў турызме

Сутнасць, віды і характарыстыка падаткаў. Абавязковыя элементы сістэмы падаткаабкладання. Падатковы Кодэкс Рэспублікі Беларусь. Асаблівасці падаткаабкладання турыстычных прадпрыемстваў.

Асноўныя падаткі і адлічэнні. Уплыў падатковага цяжару на дзейнасць прадпрыемства індустрыі турызму. Шляхі павышэння эфектыўнасці функцыянавання прадпрыемства ва ўмовах сучаснай падатковай сістэмы. Спрошчаная сістэма падаткаабкладання.

Тэма 9. Эканамічная эфектыўнасць дзейнасці прадпрыемства індустрыі турызму

Паняцце даходу турыстычнага прадпрыемства. Крыніцы фарміравання даходаў. Прыбытак прадпрыемства індустрыі турызму. Механізм размеркавання і выкарыстання прыбытку на турыстычным прадпрыемстве. Рэнтабельнасць турыстычнага прадпрыемства. Кіраванне прыбыткам і рэнтабельнасцю на прадпрыемстве індустрыі турызму.

Асноўныя паказчыкі фінансава-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства індустрыі турызму. Мэты і віды фінансавага аналізу. Сістэма ацэнкі паказчыкаў функцыянавання і развіцця турыстычнага прадпрыемства.

Тэма 10. Планаванне дзейнасці турыстычнага прадпрыемства

Сутнасць і змест планавання. Класіфікацыйныя прыкметы планавання і віды планаў. Спосабы і метады планавання дзейнасці прадпрыемства індустрыі турызму. Стратэгічнае планаванне.

Паняцце бізнес-плана. Функцыі, задачы і асноўныя этапы бізнес-планавання. Віды бізнес-планаў.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін		Колькасць гадзін КСР	Форма кантролю ведаў
		Лекцыі	Семінарскія заняткі		
1	2	3	4	5	6
	Уводзіны	2			
1.	Развіццё міжнароднага і асаблівасці беларускага турызму на сучасным этапе	2			
2.	Турыстычнае прадпрыемства як суб'ект гаспадарання	2		2	выбарачнае апытанне, тэставае заданне, мультымедыя прэзентацыя
3.	Асноўныя і абаротныя фонды, нематэрыяльныя актывы турыстычнага прадпрыемства	2		2	выбарачнае апытанне, тэставае заданне, мультымедыя прэзентацыя
4.	Працоўныя рэсурсы і аплата працы ў турызме	2	2		
5.	Фінансавыя рэсурсы турыстычнага прадпрыемства	2	2		
6.	Выдаткі прадпрыемства індустрыі турызму	2	2		
7.	Коштаўтварэнне ў турызме	2	2		
8.	Падаткі і падаткаабкладанне ў турызме	2			
9.	Эканамічная эфектыўнасць прадпрыемства індустрыі турызму	2		2	выбарачнае апытанне, тэставае заданне, мультымедыя прэзентацыя

1	2	3	4	5	6
10.	Планаванне дзейнасці турыстычнага прадпрыемства	2		2	выбарачнае апытанне, тэставае заданне, мультымедыя прэзентацыя
Разам		**22**	**8**	**8**	

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

Літаратура

Асноўная

1. Андросова, Г. А. Экономика и маркетинг туристской индустрии. Экономика туризма : учебное пособие / Г. А. Андросова, И. В. Енченко. – Санкт-Петербург : Национальный государственный Университет физической культуры, спорта и здоровья имени П. Ф. Лесгафта, 2022. – 92 с. : ил., табл. – Режим доступа: по подписке. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=702730 (дата обращения: 15.05.2026). – Библиогр. в кн. – Текст : электронный.

2. Экономика, менеджмент и маркетинг в индустрии туризма и гостеприимства : учебное пособие / О. А. Альмухамедова, Е. Н. Маслак, Ю. А. Пшеничных [и др.] ; Южный федеральный университет. – Ростов-на-Дону ; Таганрог : Южный федеральный университет, 2024. – 98 с. : ил., табл. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=724337 (дата обращения: 17.06.2026).

Дадатковая

1. Лежнин, В. В. Инновационная деятельность на предприятии туризма : учебное пособие / В. В. Лежнин. – Йошкар-Ола : Поволжский государственный технологический университет, 2022. – 104 с. : схем., табл., ил. – Режим доступа: по подписке. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=696357 (дата обращения: 15.05.2026). – Библиогр. в кн. – Текст : электронный.

2. Экономика и управление социальной сферой : учебник / Е. Н. Жильцов, Е. В. Егоров, Т. В. Науменко [и др.] ; под ред. Е. Н. Жильцова, Е. В. Егорова ; Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова. – 4-е изд., стер. – Москва : Дашков и К°, 2022. – 496 с. : ил., табл. – Режим доступа: по подписке. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=710010 (дата обращения: 15.05.2026). – Библиогр. в кн. – Текст : электронный.

Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Арганізацыя вучэбнай работы студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне "Эканоміка турызму".

Для дыягностыкі атрыманых студэнтамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

- тэставыя заданні па асобных падраздзелах і вучэбнай дысцыпліне ў цэлым;
- пісьмовыя работы па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;
- мультымедыя прэзентацыі па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;
- выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне заліку.

Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных тэмах вучэбнай дысцыпліны "Эканоміка турызму", вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўку да заліку.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

- фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;
- засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;
- развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з'яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення заліку.

Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны "Эканоміка турызму" рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання студэнтаў: лекцыйныя і семінарскія заняткі, а таксама элементы самастойнай работы.

У лік эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю ў студэнтаў крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; кантэнт-аналізу; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.